# 5 чэрвеня



# Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя

# 5 чэрвеня – Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя

Гэта галоўнае экалагічнае свята, заснаванае Генеральнай Асамблеяй ААН у 1972 годзе.

Дата яго правядзення звязана з адкрыццём у гэты дзень Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі. Канферэнцыя прыняла дэкларацыю, якая змяшчае 27 прынцыпаў, якімі павінны кіравацца ўсе дзяржавы ў сваёй дзейнасці, накіраванай на ахову навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў. У ёй упершыню было абвешчана, што ахова і аздараўленне навакольнага асяроддзя для цяперашніх і будучых пакаленняў з'яўляецца першаснай задачай чалавецтва. Сусветны дзень навакольнага асяроддзя заснаваны для таго, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем аховы навакольнага асяроддзя, неабходнасці прыняцця практычных мер па прадухіленні глабальнага экалагічнага крызісу.

Менавіта ў гэты дзень ва ўсім свеце праходзяць акцыі і мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя.

***Бяседавіцкая бібліятэка флоры і фаўны заклікае задумацца аб экалагічных праблемах, звярнуць увагу на стан навакольнага асяроддзя!***